**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

Вучэбна-метадычнае аб'яднанне па гуманітарнай адукацыі

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_____________ І.А. Старавойтава
"14" 12 2022 г.
Рэгістрацыйны № ТД- G1. 038 /тып.

# ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА САВЕЦКАГА НАРОДА (У КАНТЭКСЦЕ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ)

Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне
для ўстаноў вышэйшай адукацыі

**УЗГОДНЕНА:**
Старшыня вучэбна-метадычнага аб'яднання
па гуманітарнай адукацыі
_____________ А.Г. Прахарэнка
"15" 12 2022 г.

**УЗГОДНЕНА:**
Начальнік Галоўнага ўпраўлення
прафесійнай адукацыі
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
_____________ С.А. Каспяровіч
"13" 12 2022 г.

**УЗГОДНЕНА:**
Прарэктар па навукова-метадычнай рабоце
Дзяржаўнай установы адукацыі
"Рэспубліканскі інстытут вышэйшай
школы"
_____________ І.У. Цітовіч
"12" 12 2022 г.

Эксперт-нормакантралёр
_____________ С.М. Арцем'ева
"__" 12 2022 г.

**Мінск 2022**

Информация об изменениях размещается на сайтах:
http://www.edustandart.by
http://www.nihe.bsu.by

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

А.А. Каваленя – акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў дзяржаўнай навуковай установы «Нацыянальная акадэмія навук Беларусі», доктар гістарычных навук, прафесар, акадэмік, навуковы кіраўнік;
А.М. Літвін – загадчык цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», доктар гістарычных навук, прафесар;
В.В. Даніловіч – рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
У.В. Здановіч – загадчык кафедры гісторыі Беларусі ўстановы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна», доктар гістарычных навук, прафесар;
С.В. Паноў – прафесар кафедры гісторыка-культурнай спадчына Беларусі дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
М.А. Краснова – старэйшы навуковы супрацоўнік цэнтра гісторыі навукі і архіўнай справы дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдат педагагічных навук, дацэнт.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
Кафедра гісторыі Беларусі і славянскай гісторыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (пратакол № 10 ад 26.04.2022);
У.С. Кошалеў – загадчык кафедры гісторыі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук, прафесар.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**
Кафедрай гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы» (пратакол № 10 ад 10.11.2022);
Вучэбна-метадычным аб’яднаннем па гуманітарнай адукацыі (пратакол № 8 ад 15.11.2022).

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» прызначана для рэалізацыі на I ступені вышэйшай адукацыі (агульнай вышэйшай адукацыі) у межах цыкла (модуля) сацыяльна-гуманітарных дысцыплін для студэнтаў усіх спецыяльнасцей вышэйшай адукацыі (за выключэннем профільных спецыяльнасцей) у якасці дысцыпліны па выбары ўстановы вышэйшай адукацыі варыятыўнай часткі (кампанент установы адукацыі) цыкла (модуля) сацыяльна-гуманітарных дысцыплін.

**Месца вучэбнай дысцыпліны** «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» **у сістэме сацыяльна-гуманітарных і грамадска-палітычных ведаў** вызначаецца прадметам яе вывучэння, якім з'яўляюцца заканамернасці і асаблівасці развіцця беларускай нацыі ў міжваенны перыяд і гады ваенных выпрабаванняў, гераічныя і трагічныя падзеі на франтах Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў, іх уздзеянне і ўплыў на лёс народаў Еўропы і Савецкага Саюза, жыццё насельніцтва на акупаваных тэрыторыях і ў савецкім тыле, уклад беларускага народа ў разгром германскіх агрэсараў.

Навукова-тэарэтычны змест праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» складзены ў адпаведнасці з арыгінальнай навуковай канцэпцыяй гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з улікам найноўшых дасягненняў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі на аснове архіўных дакументаў і матэрыялаў. Айчынная гісторыя падаецца ў праграме ў кантэксце сусветных падзей з выкарыстаннем метадалагічных падыходаў, звязаных з асвятленнем вайны як агульначалавечай з'явы. Інавацыйнай адметнасцю праграмы з'яўляецца прадстаўленне зместу вучэбнага матэрыялу ў кантэксце канструявання ўласна беларускага вобраза гістарычнага мінулага. Такі вобраз звязаны з фарміраваннем гістарычнай памяці сучаснага беларускага грамадства ў межах ажыццяўлення дзяржаўнай гістарычнай палітыкі Рэспублікі Беларусь, накіраванай на замацаванне беларускай нацыянальнай канцэпцыі гістарычнага мінулага і беларускай мадэлі памяці ва ўмовах спроб фальсіфікацыі прычын і вынікаў Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

**Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны** абумоўлена шэрагам сучасных геапалітычных, грамадска-палітычных і ўласна адукацыйных фактараў. Па дадзеных даследавання Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі (2016) для беларусаў адной з найбольш значных падзей гістарычнага мінулага савецкага перыяду з'яўляецца Перамога савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Канцэпт Вялікай Перамогі, крыніцай якой стала сяброўства савецкіх народаў, ва ўмовах сучаснай геапалітычнай сітуацыі спалучаецца з еўрапейскім канцэптам перамогі над германскім нацызмам у гады Другой сусветнай вайны. У такіх умовах гістарычнае мінулае можа падвяргацца пераацэнцы і інтэрпрэтацыі без адпаведных на то падстаў, што вядзе да палярызацыі поглядаў на падзеі вайны і не дазваляе ажыццявіць кансалідацыйную функцыю гістарычнай памяці, падмяняючы яе канфрантацыяй.

Вызначальным фактарам у арганізацыі адукацыйнай дзейнасці бачыцца працэс выхавання сучаснай студэнцкай моладзі як грамадзян суверэннай Рэспублікі Беларусь, для якіх вопыт патрыятычнага ўздыму баларускага народа ў гады ваенных выпрабаванняў з'яўляецца шматкампанентнай сацыяльна-культурнай з'явай, якая грунтуецца на каштоўнасных адносінах да сваёй Радзімы і нацыянальнай формы дзяржаўнасці, абароненай у час барацьбы за захаванне свабоды і незалежнасці Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Без грунтоўных ведаў па гісторыі сваёй Айчыны і асабліва гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, без уліку станоўчага і адмоўнага вопыту жыцця міжнароднай супольнасці, беларускага этнасу і нацыянальных меншасцяў нельга паспяхова будаваць грамадскія ўзаемаадносіны ў сучаснасці. Актуальнасць дадзенай пазіцыі абумоўлена патрабаваннямі Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (2010), Канцэпцыі гісторыі беларускай дзяржаўнасці, распрацаванай беларускай акадэмічнай гістарычнай навукай (2011–2017) і нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі, прынятай на IV Міжнародным кангрэсе гісторыкаў Беларусі «Гістарычная навука Беларусі: асобы, канцэпцыі, дасягненні (да 90-годдзя Інстытута гісторыі НАН Беларусі)» (2019), Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (2019). На VI Усебеларускім народным сходзе (2021) было адзначана, што гістарычная памяць з'яўляецца асновай фарміравання светапогляду асобы, яе грамадзянскіх і патрыятычных якасцей, садзейнічае нацыянальнай самаідэнтыфікацыі асобы. Канкрэтнай праявай дзяржаўнай гістарычнай палітыкі стала ўстанаўленне згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 206 ад 07.06.2021 г. Дня народнага адзінства 17 верасня, што адзначаецца як знакавая гістарычная падзея ў жыцці беларускага народа і дзяржавы, звязаная з захаваннем гістарычнай памяці аб падзеях восені 1939 г., калі быў пакладзены пачатак ліквідацыі гістарычнай несправядлівасці, абумоўленай Рыжскім мірным дагаворам, які геапалітычна падзяліў краіну, і уз'яднаннем беларускай нацыі ў межах савецкай сацыялістычнай дзяржавы. Прыняцце Праграмы патрыятычнага выхавання насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2022–2025 гг. (2021), Закона аб генацыдзе беларускага народа (2022), унясенне ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь палажэння аб тым, што дзяржава забяспечвае захаванне гістарычнай памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны (2022), стварэнне Рэспубліканскага савета па гістарычнай палітыцы (2022) з'яўляюцца сродкамі кансалідацыі беларускага грамадства, выхавання патрыятычных і грамадзянскіх якасцей падрастаючага пакалення, фарміравання «імунітэта» супраць чужых ідэалаў і каштоўнасцей. Пералічаныя фактары, а таксама змена згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 117 ад 23.03.2022 г. назвы памятнай даты 22 чэрвеня на Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыда беларускага народа актуалізуе прызначэнне вучэбнай дысцыпліны «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» у працэсе фарміравання гісторыка-дзяржаўнага светапогляду студэнцкай моладзі.

**Мэтай вывучэння вучэбнай дысцыпліны** з'яўляецца фарміраванне грамадска-палітычнага светапогляду студэнтаў, які будзе садзейнічаць іх самавызначэнню ў працэсе паглыбленага асэнсавання подзвігу савецкага народа і геапалітычных урокаў Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў, захаванню і

умацаванню гістарычнай памяці аб ролі Савецкага Саюза і краін антыгітлераўскай кааліцыі ў Перамозе над германскім нацызмам, трансляцыі гістарычнай праўды і норм паводзін, каштоўнасцей і традыцый, выпрацаваных беларускім народам у перыяд пераадолення трагічных ваенных падзей.

Несумненна, вывучэнне курса будзе спрыяць не толькі ўмацаванню гістарычнай памяці маладога пакалення, але і фарміравання яго светапоглядных і грамадзянска-палітычных кампетэнцый:

- патрыятызму, якія праяўляюцца ў гатоўнасці да замацавання дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь праз сваю прафесійную дзейнасць з улікам ведання небяспекі вырашэння міжнародных праблем ваеннымі сродкамі; у рэалізацыі і выкананні сваіх канстытуцыйных правоў і абавязкаў грамадзяніна на аснове ведання гістарычнага вопыту беларускага народа, назапашанага ў гады Вялікай Айчыннай вайны;
- асобаснай арыентацыі, якія звязаны з уменнем фармуляваць уласныя светапоглядныя прынцыпы (пункт гледжання) на аснове гістарычных урокаў Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў для Беларусі, суадносіць перспектывы ўласнай жыццядзейнасці з перспектывамі развіцця сучаснага беларускага грамадства;
- сацыяльнага ўзаемадзеяння, якія прадугледжваюць фарміраванне ўмення абгрунтоўваць свае адносіны да норм паводзін і каштоўнасцей, выпрацаваных беларускім народам у час ваенных выпрабаванняў на аснове арыентацыі ў яго гістарычным досведзе;
- камунікацыі ў сучасным інфармацыйным грамадстве і глабальным шматпалярным свеце з улікам умення захоўваць гістарычную памяць пра ролю Савецкага Саюза і яго саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі ў Перамозе над германскім нацызмам і на аснове прытрымлівання талерантных традыцый беларускага народа.

Для рэалізацыі абазначанай вышэй мэты **задачамі выкладання вучэбнай дысцыпліны** «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» вызначаны наступныя:

- фарміраванне ў студэнтаў грамадзянскіх і патрыятычных якасцей асобы;
- выхаванне ў студэнцкай моладзі пачуцця адказнасці за будучыню сваёй дзяржавы і сусветнага супольніцтва;
- фарміраванне ў студэнтаў ведаў аб гераічных і трагічных уроках Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, паўсядзённым жыцці насельніцтва на акупаванай тэрыторыі і ў савецкім тыле, укладзе прадстаўнікоў шматнацыянальнага народа Беларусі ў разгром германскіх захопнікаў, уплыве ваенных падзей на лёсы народаў Савецкага Саюза і Еўропы.

Па выніках вывучэння навукова-тэарэтычнага зместу **студэнты павінны ведаць**:

- асноўныя перыяды Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў і іх змест;
- сутнасць акупацыйнай палітыкі германскіх улад;
- месца і ролю Беларусі ў геапалітычных працэсах у міжваенны перыяд і ў гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў,

- уклад беларускага народа ў Перамогу над нацызмам і яе гістарычнае значэнне;

- прыклады гераізму, мужнасці, самаахвярнасці абаронцаў Радзімы – воінаў Чырвонай Арміі, партызан, падпольшчыкаў, удзельнікаў руху Супраціўлення і вайсковых фарміраванняў саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі;

- розныя пункты гледжання на праблемныя пытанні ў асвятленні падзей і выніке Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Па выніках засваення спосабаў дзейнасці **студэнты павінны ўмець**:

- характарызаваць становішча беларускага народа і яго ролю ў барацьбе супраць германскіх захопнікаў у розныя перыяды Вялікай Айчыннай вайны;

- раскрываць чалавеканенавісніцкі характар германскай акупацыйнай палітыкі;

- характарызаваць эвалюцыю геапалітычнага становішча беларускай дзяржавы ў гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў;

- вызначаць крыніцы і ацэньваць значэнне Перамогі савецкага народа;

- ушаноўваць памяць пра подзвіг беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны;

- супрацьстаяць фальсіфікацыям ў асвятленні падзей і вынікаў Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, прыводзіць аргументы і выказваць асабісты пункт гледжання.

Па выніках навучання **студэнты павінны авалодаць**:

- навукова-тэарэтычнымі ведамі, неабходнымі для сацыялізацыі асобы студэнта (вырашэння сацыяльна-асабістых задач);

- практыка-арыентаванымі ўменнямі, звязанымі з канкрэтнай спецыяльнасцю, па якой арганізуецца навучанне студэнтаў ва ўстанове вышэйшай адукацыі.

**Метадычныя прыёмы і сродкі навучання** павінны ўлічваць магчымасць прыцягнення студэнтаў да пошуку і верыфікацыі вучэбнай і сацыяльна-палітычнай інфармацыі, набыцця вопыту самастойнага вырашэння вучэбных (сацыяльна-палітычных) сітуацыйных задач. У ліку метадычных формаў навучання варта рэкамендаваць праблемныя, праектныя, даследчыя, дыскусійныя, ролевыя і т. п., якія спрыяюць рэалізацыі кампетэнтнастнага падыходу. Уяўляецца, што ў кожнай вышэйшай навучальнай установе, змест вучэбнай дысцыпліны можа быць дапоўнены і канкрэтызаваны з улікам прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў у залежнасці ад спецыяльнасці, па якой арганізуецца навучанне ва ўстанове вышэйшай адукацыі.

**Самастойная работа студэнтаў** прадугледжвае выкананне кантрольных работ і праектаў, падрыхтоўку рэфератаў, азнаямленне з вучэбнай, вучэбна-метадычнай, навуковай, навукова-папулярнай, хрэстаматыйнай літаратурай, аналіз гістарычных крыніц, выкарыстанне ў якасці прыкладаў (культурна-гістарычных аналагаў) канкрэтных сітуацый, выкананне вучэбна-даследчых работ, стварэнне партфоліа, удзел у дзейнасці студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый і канферэнцый, выступленні на конкурсах, стварэнне электронных адукацыйных рэсурсаў, падрыхтоўку і правядзенне дэбатаў, ролевых гульняў і т.п.

Пры арганізацыі работы з вучэбным дапаможнікам варта ўлічыць, што кожны раздзел уключае гістарыяграфічную характарыстыку найбольш праблемных пытанняў вывучаемага перыяду. Напрыканцы кожнай з тэм размяшчаюцца дакументальныя матэрыялы і фрагменты даследчых (навуковых) рабоы, вывучэнне якіх патрабуе адказаў на розныя па сваёй складанасці пытанні і выканання практычных заданняў. Работу з гістарычнымі дакументамі мэтазгодна праводзіць як самастойна, так і на семінарскіх занятках. Заключэнне, якое прадугледжвае падагульненне вынікаў навучання, можа загадзя мець практычнае замацаванне, што рэалізуецца ў ходзе правядзення экскурсій, наведвання памятных месцаў і мемарыяльных комплексаў, пры зборы краязнаўчых матэрыялаў, падрыхтоўцы творчых даследчых работ і стварэнні мясцовых летапісаў памяці аб Вялікай Айчыннай вайне, пры афармленні куткоў і пакояў воінскай славы.

**Дыягностыка вынікаў навучання** па вучэбнай дысцыпліне «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» вызначаецца ў адпаведнасці з ацэнкай вучэбных дасягненняў студэнтаў па дысцыплінах сацыяльна-гуманітарнага цыкла (модуля) і ажыццяўляецца згодна 10-бальнай шкале ацэнкі. Варта ў межах рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу да навучання кіравацца патрабаваннямі да ведаў і ўменняў студэнтаў, якія павінны быць імі засвоены. Пры ажыццяўленні кантролю за самастойнай работай студэнтаў неабходна ўлічваць патрабаванні да іх падрыхтоўкі, якія вызначаны праз вынікі навучання да кожнага з раздзелаў праграмы і могуць быць канкрэтызаваны ў залежнасці ад канкрэтнай спецыяльнасці, па якой арганізуецца навучанне ва ўстанове вышэйшай адукацыі.

**Структура зместу дысцыпліны** складаецца з уводзінаў, трох раздзелаў і заключэння. Праграма дысцыпліны разлічана на 72 вучэбныя гадзіны, з якіх 36 – аўдыторныя гадзіны, у тым ліку: 24 – лекцыйных, 12 – семінарскіх гадзін, 36 – самастойная работа студэнтаў. Форма кантролю прадугледжвае дыферэнцыраваны залік. Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 2 заліковыя адзінкі.

## 2. ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | Аўдыторныя | | Самастойная работа студэнтаў |
| | Лекцыі | Семінарскія заняткі | |
| **Уводзіны** | 1 | | |
| **Раздзел І.** Савецкі Саюз і краіны свету напярэдадні і ў пачатку Другой сусветнай вайны | **8** | **4** | |
| **Тэма 1.** Міжнароднае становішча напярэдадні Другой сусветнай вайны | 2 | 1 | |
| **Тэма 2.** Пачатак Другой сусветнай вайны і падзеі ў Беларусі | 2 | 1 | |
| **Тэма 3.** Акупацыя Германіяй краін Еўропы | 2 | 1 | |
| **Тэма 4.** СССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны | 2 | 1 | |
| **Раздзел ІІ.** Барацьба савецкага народа супраць германскай агрэсіі | **6** | **3** | |
| **Тэма 5.** Пачатак Вялікай Айчыннай вайны | 2 | 1 | |
| **Тэма 6.** Акупацыйны рэжым | 2 | 1 | |
| **Тэма 7.** Партызанская і падпольная барацьба на акупіраванай тэрыторыі | 2 | 1 | |
| **Раздзел ІІІ.** Разгром фашысцкага блока. Завяршэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў | **8** | **4** | |
| **Тэма 8.** Падзеі на франтах вайны. Крах наступальнай стратэгіі германскага вермахта | 2 | 1 | |
| **Тэма 9.** Вызваленне Беларусі ад германскіх захопнікаў | 2 | 1 | |
| **Тэма 10.** Савецкі тыл у гады вайны | 2 | 1 | |
| **Тэма 11.** Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. Перамога! | 2 | 1 | |
| **Заключэнне** | 1 | 1 | |
| Усяго | **24** | **12** | **36** |

# 3. ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**Уводзіны**

Прадмет, мэты і задачы дысцыпліны, яе структура і змест.

Актуальнасць вывучэння гісторыі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Навуковыя плыні і гістарычныя школы. Перыядызацыя Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Гістарыяграфія і крыніцы.

Перамога над германскім нацызмам у Другой сусветнай вайне. Гістарычная памяць аб Перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

## Раздзел I
## Савецкі Саюз і краіны свету напярэдадні і ў пачатку Другой сусветнай вайны

***Тэма 1. Міжнароднае становішча напярэдадні Другой сусветнай вайны***

Міжнародная дзейнасць Германіі ў 1930-я гг. Ачагі ваеннай напружанасці (Далёкі Усход, Еўропа, Афрыка). Фарміраванне фашысцкага блока. Антыкамінтэрнаўскі пакт. СССР і Ліга Нацый. Грамадзянская вайна ў Іспаніі.

Мюнхенскае пагадненне. Падзел Чэхаславакіі. Спроба стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Савецка-французска-англійскія перамовы. Савецка-германскія дагаворы і сакрэтныя пратаколы 1939 г.

***Тэма 2. Пачатак Другой сусветнай вайны і падзеі ў Беларусі***

Пачатак Другой сусветнай вайны. Напад Германіі на Польшчу. Аб’яўленне Германіі вайны Францыяй і Вялікабрытаніяй. Прычыны і характар вайны.

Уступленне войскаў Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну. Уз’яднанне Беларусі. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні ў заходніх абласцях БССР.

Становішча ў заходніх рэгіёнах Савецкага Саюза. СССР і краіны Балтыі. Савецка-фінляндская вайна. Удзел беларусаў у фінскай кампаніі.

***Тэма 3. Акупацыя Германіяй краін Еўропы***

“Дзіўная вайна”. Акупацыя Германіяй Даніі, Нарвегіі, Бельгіі, Галандыі і Люксембурга. Наступленне германскіх войскаў у Францыі. Капітуляцыя Францыі. Берлінскі пакт. Агрэсія Германіі на Балканах. Дзейнасць СССР на міжнароднай арэне. Пакт аб нейтралітэце паміж СССР і Японіяй.

Пачатак Руху Супраціўлення. Падрыхтоўка Германіі да вайны з СССР. Прыняцце плана “Барбароса”.

***Тэма 4. СССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны***

СССР у перадваенныя гады. Мерапрыемствы па ўмацаванні абараназдольнасці краіны. Ваенна-патрыятычная і ваенна-абарончая работа сярод насельніцтва.

Узброеныя сілы Савецкага Саюза. Заходняя Асобая ваенная акруга.

Па выніках вывучэння навукова-тэарэтычнага зместу раздзела **студэнты павінны ведаць**:

- міжнароднае становішча ва ўмовах нарастання пагрозы вайны;
- асаблівасці геапалітычнага становішча беларускіх земель ва ўмовах пачатку Другой сусветнай вайны;
- гістарычнае значэнне уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР;
- мерапрыемствы савецкага ўрада па ўмацаванні абароназдольнасці.

Па выніках засваення спосабаў дзейнасці **студэнты павінны ўмець**:

- вызначаць прычыны палітыкі ўміратварэння агрэсара і няўдачы стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі;
- аналізаваць знешнепалітычнае становішча, у якім адбываўся працэс уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР;
- параўноўваць розныя пункты гледжання на працэс уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР;
- параўноўваць суадносіны ўзброеных сіл Германіі і СССР у межах Заходняй Асобай ваеннай акругі.

Па выніках навучання **студэнты павінны авалодаць**:

- навукова-тэарэтычнымі ведамі, неабходнымі для сацыялізацыі асобы студэнта (вырашэння сацыяльна-асобасных задач);
- практыка-арыентаванымі уменнямі, звязанымі з канкрэтнай спецыяльнасцю, па якой арганізуецца навучанне студэнтаў ва ўстанове вышэйшай адукацыі.

**Прыкладная праблематыка** семінарскіх заняткаў і самастойнай работы студэнтаў:

- савецка-германскія дагаворы і сакрэтныя пратаколы 1939 г. у гістарычным лёсе беларускага народа;
- уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР у люстэрку навуковых і палітычных дыскусій: аднаўленне гістарычнай справядлівасці ў адносінах да беларускага народа ці страта суверэнітэту Польшчы;
- вынікі сацыяльна-эканамічных і палітычных пераўтварэнняў у заходніх абласцях БССР.

Па выніках вывучэння раздзела рэкамендуецца правядзенне самастойнай работы.

## Раздзел II
## Барацьба савецкага народа супраць германскай агрэсіі

***Тэма 5. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны***

Мэты Германіі ў вайне супраць Савецкага Саюза. План "маланкавай вайны". Напад Германіі на СССР. Прыгранічныя баі ў Беларусі. Абарона Брэсцкай крэпасці.

Дзейнасць савецкіх і партыйных органаў па мабілізацыі сіл і сродкаў для барацьбы з агрэсарам. Дзяржаўны камітэт Абароны (ДКА). Перавод прамысловасці на ваенныя рэйкі. Эвакуацыя насельніцтва, матэрыяльных рэсурсаў і іншых каштоўнасцей у тыл СССР.

Знішчальныя атрады і народнае апалчэнне. Баявыя дзеянні на савецка-германскім фронце. Абарончыя баі пад Мінскам, Бабруйскам, Оршай, Віцебскам, Магілёвам, Гомелем. Магілёўская бітва. Гераізм савецкіх воінаў. Дапамога насельніцтва Чырвонай Арміі. Дзейнасць першых партызанскіх атрадаў, дыверсійных груп і падпольных арганізацый. (М.П.Шмыроў, В.З.Корж, І.З.Ізох, І.А.Ярош, М.І.Жукоўскі і інш.). Першыя партызаны – Героі Савецкага Саюза (Ц.П.Бумажкоў, Ф.І.Паўлоўскі).

Прычыны няўдач Чырвонай Арміі летам-восенню 1941 г.

Дзейнасць СССР на міжнароднай арэне. Ваенна-эканамічнае супрацоўніцтва паміж Савецкім Саюзам Вялікабрытаніяй і ЗША. Пачатак стварэння антыгітлераўскай кааліцыі. Ваенныя дзеянні ў канцы 1941 года. Уступленне ў вайну ЗША і Японіі. Маскоўская бітва. "Віцебскія вароты".

### *Тэма 6. Акупацыйны рэжым*

Генеральны план "Ост". Ваенна-эканамічныя мэты захопнікаў. Ваенна-паліцэйскія органы вынішчэння. Тэрытарыяльны падзел акупіраваных заходніх рэгіёнаў СССР. Рэйхскамісарыяты "Остланад" і "Украіна".

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел беларускай акупіраванай тэрыторыі: Генеральная акруга Беларусь, Генеральная акруга Жытомір, Генеральная акруга Валынь – Падолія, Генеральная акруга Беласток, Генеральная акруга Літва, вобласць армейскага тылу групы армій "Цэнтр".

Акупацыйны апарат кіравання. Склад і структура. Генеральны камісарыят Беларусі, абласныя і мясцовыя камісарыяты, раённыя і валасныя ўправы. Дапаможныя акупацыйныя органы кіравання.

Палітыка генацыду. Знішчэнне насельніцтва і ваеннапалонных. Злачынная дзейнасць СС, службы бяспекі (СД) германскай палітыкі. Айнзацгрупы і зондэркаманды. Карныя экспедыцыі. Канцэнтрацыйныя лагеры, турмы. Гета. Вываз насельніцтва на прымусовую працу ў Германію. "Остарбайтары". Удзел замежных, мясцовых і іншых ваенна-паліцэйскіх фарміраванняў у генацыдзе мясцовага насельніцтва, ваеннапалонных і яўрэяў. Ваенна-эканамічныя фарміраванні.

Калабарацыянізм. Германская прапаганда і агітацыя: формы і метады. Школа, тэатр, друк, радыё, царква на акупіраванай тэрыторыі. Нацысцкая палітыка міжнацыянальных адносін. Эканамічная палітыка акупацыйных улад. Рабаванне матэрыяльных рэсурсаў і культурных каштоўнасцей. Паўсядзённае жыццё насельніцтва ва ўмовах германскай акупацыі.

### *Тэма 7. Партызанская і падпольная барацьба на акупіраванай тэрыторыі*

Узнікненне, станаўленне і развіццё партызанскага руху. Падпольная барацьба. Дзейнасць партыйных і камсамольскіх органаў і арганізацый ва ўмовах акупацыі.

Стварэнне Цэнтральнага і Беларускага штабоў партызанскага руху. Партызанскія атрады і брыгады. Арганізацыйная структура патрыятычнага супраціўлення.

Баявая дзейнасць партызан. Дыверсіі на чыгунцы і шашэйных дарогах. Рэйкавая вайна і яе мэты. Разгром варожых гарнізонаў. Партызанскія рэйды. Партызанская разведка. Барацьба супраць карных экспедыцый. Узаемадзеянне беларускіх, рускіх, украінскіх, літоўскіх і латышскіх партызан. Роля партызанскага руху ў барацьбе супраць германскіх захопнікаў.

Узаемаадносіны партызан і насельніцтва. Выратаванне насельніцтва ад знішчэння і прымусовага ўгону ў Германію. Партызанскія зоны. Арганізацыйнае ўмацаванне партызанскіх фарміраванняў і падпольных арганізацый. Узмацненне антыфашысцкага супраціўлення на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Усенародны характар барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пашырэнне партызанскіх зон. Партызанскія рэзервы. Быт партызан. Прапаганда і агітацыя сярод насельніцтва. Культурна-асветніцкая дзейнасць партызан.

Партыйнае, камсамольскае, антыфашысцкае падполле. Арганізацыйная структура і склад. Формы і метады барацьбы патрыётаў. Камсамольска-маладзёжнае падполле. Дзейнасць падпольшчыкаў Мінска, Магілёва, Гомеля, Брэста, Гродна і іншых гарадоў Беларусі. Дыверсіі на чыгуначных вузлах Оршы, Асіповіч, Калінкавіч, Полацка і інш. Складанасці падпольнай і дыверсійнай барацьбы. Узаемадзеянне падпольшчыкаў і партызан у ходзе барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Антыфашысцкія патрыятычныя групы і арганізацыі ў заходніх абласцях рэспублікі. Армія Краёва і яе формы барацьбы. Супраціўленне ў гета і канцэнтрацыйных лагерах.

Дапамога савецкага тылу і мясцовага насельніцтва партызанам і падпольшчыкам.

Па выніках вывучэння навукова-тэарэтычнага зместу раздзела **студэнты павінны ведаць**:

- прыклады гераізму воінаў Чырвонай Арміі ў абарончых баях на тэрыторыі Беларусі;
- сутнасць германскага акупацыйнага рэжыму;
- сутнасць калабарацыянісцкага руху на акупаванай тэрыторыі Беларусі;
- прыклады партызанскай і падпольнай барацьбы на акупаванай тэрыторыі Беларусі.

Па выніках засваення спосабаў дзейнасці **студэнты павінны ўмець**:

- аналізаваць прычыны няўдач Чырвонай Арміі ў абарончых баях на тэрыторыі Беларусі;
- вызначаць ваенна-стратэгічнае значэнне абарончых баёў на тэрыторыі Беларусі летам-восенню 1941 г.;
- характарызаваць палітыку генацыду і ўшаноўваць памяць ахвяр германскага акупацыйнага рэжыму;

- вызначаць прычын і характар калабарацыянісцкага руху на акупіраванай тэрыторыі Беларусі;

- вызначаць вытокі патрыятызму беларускага народа.

Па выніках навучання **студэнты павінны авалодаць**:

- навукова-тэарэтычнымі ведамі, неабходнымі для сацыялізацыі асобы студэнта (вырашэння сацыяльна-асобасных задач);

- практыка-арыентаванымі ўменнямі, звязанымі з канкрэтнай спецыяльнасцю, па якой арганізуецца навучанне студэнтаў ва ўстанове вышэйшай адукацыі.

**Прыкладная праблематыка** семінарскіх заняткаў і самастойнай работы студэнтаў:

- 22 чэрвеня як Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыда беларускага народа;
- партызанскі рух на акупаванай тэрыторыі Беларусі: станаўленне і развіццё, узаемаадносіны з мясцовым насельніцтвам;
- Закон аб генацыдзе беларускага народа як актуалізацыя гістарычнай памяці;
- Хатынь як сімвал трагедыі жыхароў беларускіх вёсак;
- Халакост і беларускія Праведнікі народаў свету;
- малалетнія вязні фашысцкіх канцлагераў;
- беларускія остарбайтары: лёсы ў гісторыі;
- паўсядзённае жыццё насельніцтва на акупаванай тэрыторыі Беларусі;
- арганізацыя школьнай справы на акупаванай тэрыторыі Беларусі: палітыка нямецкіх акупацыйных улад і савецкія школы ў партызанскіх зонах.

Па выніках вывучэння раздзела рэкамендуецца правядзенне самастойнай работы.

## Раздзел III
## Разгром фашысцкага блока.
## Завяршэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў

### *Тэма 8. Падзеі на франтах вайны. Крах наступальнай стратэгіі германскага вермахта*

Пашырэнне маштабаў Другой сусветнай вайны. Перамогі саюзных войск у Афрыцы, Міжземнамор'і і на Ціхім акіяне.

Сталінградская і Курская бітвы. Карэнны пералом у вайне. Пачатак распаду фашысцкага блока. Умацаванне антыгітлераўскай кааліцыі. Тэгеранская канферэнцыя. Пытанне аб адкрыцці Другога фронту.

### *Тэма 9. Вызваленне Беларусі ад германскіх захопнікаў*

Пачатак вызвалення Беларусі. Першы вызвалены раённы цэнтр – Камарын. Вызваленне Гомеля, Рэчыцы. Узаемадзеянне партызан, насельніцтва і войскаў Чырвонай Арміі. Першыя аднаўленчыя мерапрыемствы.

Становішча на савецка-германскім фронце. Беларуская наступальная аперацыя “Баграціён”. Баявая дзейнасць партызан і падпольшчыкаў. “Рэйкавая вайна”.

Акружэнне і разгром германскіх армейскіх груповак пад Віцебскам, Бабруйскам, Мінскам і інш. Вызваленне Мінска. Партызанскі парад. Прыклады гераізму воінаў Чырвонай Арміі, партызан і падпольшчыкаў. Выгнанне германскіх захопнікаў з тэрыторыі Беларусі. Вызваленне Брэста. Значэнне разгрому германскіх войскаў у Беларусі. Мерапрыемствы па аднаўленні народнай гаспадаркі рэспублікі.

***Тэма 10. Савецкі тыл у гады вайны***

Перавод эканомікі на ваенныя рэйкі развіцця. Дзейнасць Камітэта Абароны. Ваенна-прамысловае будаўніцтва на Урале, Сібіры, Сярэдняй Азіі. Усход – асноўная ваенна-прамысловая база СССР. Працоўны подзвіг савецкага народа. “Усё для фронта!” Усё для Перамогі!”.

Сацыяльна-эканамічнае, культурнае і духоўнае жыццё савецкага народа. Палітычная агітацыя і прапаганда.

Дзейнасць беларускіх устаноў і арганізацый у тыле (Акадэмія Навук БССР, ВНУ, дзіцячыя дамы і г. д.). Ураджэнцы Беларусі – героі тылу.

***Тэма 11. Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. Перамога!***

Адкрыццё Другога фронту. Вызваленчы паход Чырвонай Арміі ў Еўропу. Падзеі ў Польшчы, Балгарыі, Чэхаславакіі, Румыніі, Венгрыі, Аўстрыі. Крымская канферэнцыя. Берлінская аперацыя. Сустрэча на Эльбе. Разгром германскай арміі. Заканчэнне вайны ў Еўропе. Капітуляцыя Германіі, Перамога! Патсдамская канферэнцыя.

Воіны-беларусы на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Беларусы ў складзе саюзных армій і Еўрапейскага Руху Супраціўлення.

Манжурская аперацыя войскаў Чырвонай Арміі. Бамбардзіроўка ЗША Херасімы і Нагасакі. Капітуляцыя Японіі. Заканчэнне Другой сусветнай вайны. Вынікі і ўрокі.

Беларусь – адна з краін-заснавальніц ААН. Нюрнбергскі працэс. Уклад беларускага народа ў разгром нацысцкай Германіі. Людскія і матэрыяльныя страты Беларускай ССР.

Міжнароднае значэнне Перамогі.

Па выніках вывучэння навукова-тэарэтычнага зместу раздзела **студэнты павінны ведаць**:

- гістарычныя падзеі, якія абазначалі карэнны перелом у ходзе Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў;
- прыклады гераізму воінаў Чырвонай Арміі і партызан пры вызваленні Беларусі;
- уклад беларускага народа ў разгром фашысцкай Германіі і дасягненне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне;
- прыклады ўдзелу ўраджэнцаў Беларусі ў складзе саюзных армій і Еўрапейскага Руху Супраціўлення.

Па выніках засваення спосабаў дзейнасці **студэнты павінны ўмець**:

- вызначаць стратэгічную задуму аперацыі "Баграціён";
- паважліва адносіцца да ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і захавання месцаў воінскай славы;
- вызначаць вытокі патрыятызму беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне;
- вызначаць гістарычнае значэнне Перамогі над нацызмам.

Па выніках навучання **студэнты павінны авалодаць**:

- навукова-тэарэтычнымі ведамі, неабходнымі для сацыялізацыі асобы студэнта (вырашэння сацыяльна-асобасных задач);
- практыка-арыентаванымі ўменнямі, звязанымі з канкрэтнай спецыяльнасцю, па якой арганізуецца навучанне студэнтаў ва ўстанове вышэйшай адукацыі.

**Прыкладная праблематыка** семінарскіх заняткаў і самастойнай работы студэнтаў:

- Беларуская наступальная аперацыя "Баграціён": задума і вынікі;
- "Рэйкавая вайна";
- дзейнасць інтэрнацыянальных вайсковых фарміраванняў пры вызваленні Беларусі;
- ураджэнцы Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай вайны;
- ураджэнцы Беларусі ў складзе польскай арміі генерала У.Андэрса;
- удзел ураджэнцаў Беларусі ў Еўрапейскім Руху Супраціўлення;
- працоўны гераізм ураджэнцаў Беларусі ў савецкім тыле;
- удзел БССР у заснаванні ААН: прычыны і значэнне.

Па выніках вывучэння раздзела рэкамендуецца правядзенне самастойнай работы.

**Заключэнне**

Ушанаванне памяці загінуўшых у Беларусі. Ураджэнцы Беларусі – Героі Савецкага Саюза і поўныя кавалеры ордэна Славы.

Гарады-героі. Мемарыяльныя комплексы: Трэптаў парк (Берлін). Паклонная гара (Масква). Мамаеў курган (Валгаград). Брэсцкая крэпасць-герой. Хатынь. Помнікі – Курган Славы, Трасцянец і інш.

Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, краязнаўчыя музеі. Хроніка "Памяць".

# 4. ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Асноўная літаратура

### Крыніцы і матэрыялы


1. Белорусские остарбайтеры: угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию (1941–1944) : док. и материалы : в 2 кн. / сост.: Г. Д. Кнатько (рук.) [и др.]; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск, 1996 – 1997.
2. В непокорённом Минске: Док. и материалы о подпольной борьбе сов. патриотов в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944). – Минск, 1987.
3. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): Док. и материалы. В 3 т. – Минск, 1967 – 1982.
4. В тылу врага: Листовки партийн. орг. и партизан Велик. Отечеств. войны (1941–1945 гг.). – М., 1962.
5. Геноцид белорусского народа = Genocide of the Belarusian people: информационно-аналитические материалы и документы / Генеральная прокуратура Республики Беларусь; под общей редакцией А. И. Шведа. – Минск: Беларусь, 2022. – 175 с.
6. Год кризиса, 1938 – 1939: Документы и материалы. В 2 т. – М., 1990.
7. Зборнік лістовак усенароднай партызанскай барацьбы ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941 – 1944). – Мінск, 1952.
8. Их именами названы...: Энциклопедический справочник. – Минск, 1987.
9. Комсомол Белоруссии в Великой Отечественной войне. Документы и материалы. – Минск, 1988.
10. Лагерь смерти Тростенец: док. и материалы / сост.: В.И.Адамушко [и др.]; под ред. Г.Д.Кнатько; редкол.: В.И.Адамушко [и др.]. – Минск, 2003.
11. Накануне: Западный особый военный округ (конец 1939 г. – 1941 г.) : док. и материалы / сост.: В. И. Адамушко [и др.]; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. – 2-е изд. – Минск, 2007.
12. Нюрнбергский процесс над главными немецкими военными преступниками: Сб. материалов: В 8 т. – М., 1987.
13. Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941 – 1944). – Мінск, 1995.
14. Озаричи – лагерь смерти: док. и материалы / сост.: М. И. Богдан, А. Н. Гесь, Н.А.Яцкевич; редкол.: Г.И.Баркун [и др.]. – Минск, 1997.
15. Освобожденная Беларусь: док. и материалы: в 2 кн. / сост.: В. И. Адамушко, Н. А. Бондаренко, Г. Д. Кнатько, В. Д. Селеменев; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск, 2004 – 2005.
16. Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): Краткие сведения об орг. структуре партиз. соединений, бригад (полков), отрядов (батальонов) и их личном составе. – Минск, 1983.

17. Подпольные партийные органы Компартии Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941 – 1944): Крат. сведения об орг., структуре и составе. – Минск, 1975.
18. Подпольные комсомольские органы Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941 – 1944): Крат. сведения об орг., структуре и составе. – Минск, 1976.
19. Памятники Великой Отечественной войны в Беларуси, 1942 – 1991 гг. : док. и материалы / сост.: Н.А. Денисова [и др.]; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск, 2015.
20. Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии, 1941 – 1944: Документы и материалы. – Минск, 1965.
21. Польша – Беларусь (1921–1953): сб. документов и материалов / сост.: А.Н. Вабищевич [и др.]. — Минск, 2012.
22. Преступные цели – преступные средства: Док. об оккупац. политике фашист. Германии на террит. СССР 1941 – 1944 гг. – М., 1985.
23. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг. В 2 кн. / Нац. акад, наук Беларуси, Ин-т истории / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск, 2021.
24. Сожженные деревни Белоруссии. 1941 – 1944: док. и материалы / сост.: Е. М. Гриневич [и др.]; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. – М., 2017.
25. Справочник о местах принудительного содержания гражданского населения на оккупированной территории Беларуси 1941 – 1944. Минск, 2001.
26. Судебный процесс по делу о злодеяниях, совершенных немецко-фашистскими захватчиками в Белорусской ССР (15 – 29 янв. 1946 г.). – Минск, 1947.
27. Трагедия белорусских деревень, 1941–1944 : док. и материалы / сост.: Е.М. Гриневич [и др.]; редкол.: В. И. Адамушко [і інш.]. – Минск, 2011.
28. «Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі…». Верасень 1939 г. – 1956 г. : дак. і матэрыялы : у 2 кн. / склад.: У. І. Адамушка [і інш.]; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск, 2009.
29. Холокост в Беларуси, 1941-1944: док. и материалы / сост.: Э. Г. Иоффе, Г. Д. Кнатько, В. Д. Селеменев; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск, 2002.

**Падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, курсы лекцый**

1. Беларусь у гады Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны (верасень 1939 г. – верасень 1945 г.) // Гісторыя Беларусі. У 2 ч. Ч. 2. – Мінск, 2003.
2. Беларусь: Народ. Государство. Время. / редкол.: А.А.Коваленя и др. – Минск, 2009.
3. Вторая мировая война // Новейшая история стран Европы и Америки. XX век: Учеб. для студ. высш. учеб. заведений. В 3 ч. Ч. 1: 1900 – 1945. – М., 2001.
4. Гісторыя Беларусі, 1917 – 1945 гг. : 10 кл.: хрэстаматыя: дапаможнік для вучняў агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання аўт.-склад. А. А. Каваленя, В. В. Даніловіч, М. Г. Жылінскі, С. Я. Новікаў; метад. забеспячэнне С. А. Кудраўцавай; пад рэд. А. А. Кавалені. – Мінск, 2009.
5. Долготович, Б.Д. Военачальники – сыны Беларуси на фронтах Великой Отечественной войны. – Минск, 2003.

6. Каваленя, А. А. Беларусь у выпрабаваннях вайны (1939 – 1945 гг.): Вучэб.-метад. дапам. – Минск, 2001.
7. Коваленя, А. А. С верой в Победу: Беларусь в Великой Отечественной войне: 100 вопросов и ответов / А. А. Коваленя, Б. Д. Долготович, Д. Н. Хромченко. – Минск, 2010.

## Дадатковая літаратура

1. Аблова, Р. Т. Это было в Белоруссии: Из истории борьбы молодежи в партизанских отрядах и подполье. – М., 1957.
2. Андрющенко, Н. К. На земле Белоруссии летом 1941 года. – Минск, 1985.
3. Андрющенко, Н. К. Народное ополчение Белоруссии. – Минск, 1980.
4. Баграмян, И. Х. Так начиналась война. – 3-е изд. – Киев., 1984.
5. Батов, П. И. В походах и боях. – 4-е изд. испр. и доп. – М., 1984.
6. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: Праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства. – Мінск, 1999.
7. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945: Энцыклапедыя. – Мінск, 1990.
8. Беларусь. 1941 – 1945: Подвиг. Трагедия. Память. В 2 кн. / НАН Беларуси, Институт истории; редкол.: А. А. Коваленя (пред.) и др. – Минск: Беларуская навука, 2010.
9. Беларусь партизанская. Иллюстрированная энциклопедия партизанского движения в Беларуси в годы Великой Отечественной войны. – Минск, 2019.
10. Брюханов, А. И. В штабе партизанского движения. – Минск, 1980.
11. Василевский, А. М. Дело всей жизни. – М., 1983.
12. Вклад белорусского народа в Победу в Великой Отечественной войне / А.М.Литвин [и др.] ; редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) [и др.]. 3-е изд. – Минск, 2020.
13. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны. В 3-х т. – Минск, 1983 – 1985.
14. Воронкова И.Ю. «Двадцать второго июня, ровно в четыре часа…»: Минск и минчане в первые дни Великой Отечественной войны / И.Ю.Воронкова. – Минск, 2011.
15. Галкин А. А. Германский фашизм. – М., 1989.
16. Гальдер, Ф. Военный дневник. 1939 – 1942 гг. Т. 1 – 3. – М.,1968 – 1971.
17. Герои подполья. О подпольной борьбе советских патриотов в тылу немецко-фашистских захватчиков. В 2-х вып. – М., 1965,1968.
18. Гісторыя Беларускай ССР. У 5 т. Т. 4. Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1938 – 1945 гг.). – Мінск, 1975.
19. Гречко, А. А. Годы войны. 1941 – 1943. – М., 1976.
20. Гриф секретности снят. Потери Вооруженных сил СССР в войнах, боевых действиях и военных конфликтах. Под ред. Г. Ф. Кривошеева. – М., 1993.
21. Гудериан, Г. Воспоминания Солдата. Пер. с нем. – Смоленск, 1998.
22. Деларю, Ж. История гестапо: Пер. с фр. – Смоленск, 1998.

23. Долготович, Б. Д. Созвездие героев земли белорусской / Б. Д. Долготович, А. А. Коваленя. – Минск, 2019.
24. Доморад, К. И. Разведка и контрразведка в партизанском движении Белоруссии. 1941 – 1944 гг. – Минск, 1995.
25. Ермолович, В. И., Жумарь, С.В. Огнем и мечом: Хроника пол. националист. подполья в Белоруссии (1939 – 1953 гг.). – Минск, 1994.
26. Жуков, Г.К. Воспоминания и размышления. В 3 т. – М., 1988.
27. Жумарь, С. В. Оккупационная периодическая печать на территории Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. – Минск, 1996.
28. Жылінскі, М. Г. Адукацыя на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1941 – ліпень 1944 гг.); навук. рэд. А.А.Каваленя. – Мінск, 2006.
29. Загадки ленд – лиза. – М., 2000.
30. Загорулько, М. М., Юденков, А. Ф. Крах экономических планов фашистской Германии на временно оккупированной территории СССР. – М., 1970.
31. Залескі, А. І. Быт беларускіх сялян у партызанскім краі. – Мінск, 1960.
32. Залесский, А. И. В партизанских краях и зонах: Патриотический подвиг советского крестьянства в тылу врага (1941 – 1944 гг.) – М., 1962.
33. Здановіч, У. В. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. Агляд крыніц і айчыннай гістарыяграфіі : манаграфія / У. В. Здановіч ; навук. рэд. А. А. Каваленя ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. – Брэст, 2012.
34. История белорусской государственности. В 5 т. Т. 4. Белорусская государственность накануне и в период Великой Отечественной войны и послевоенного восстановления (1939 – 1953 гг.) / А. А. Коваленя [и др.] ; отв. ред. тома Н.Б. Нестерович; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск, 2019.
35. История Второй мировой войны. 1939 – 1945. В 12 т. – М., 1973 – 1982.
36. Кейтель, В. Размышления перед казнью. Воспоминания, письма и документы начальника штаба Верховного главнокомандования вермахта. Пер. с нем. – М., 1998.
37. Кнатько, Г. Д. Рукописные издания партизан Белоруссии. – Минск, 1979.
38. Каваленя, А. А. Беларусь 1939 – 1945 гг. Война и политика. – Минск, 2001.
39. Коваленя, А. А. С верой в Победу: Беларусь в Великой Отечественной войне: 100 вопросов и ответов / А. А. Коваленя, Б. Д. Долготович, Д. Н. Хромченко. – 3-е изд. – Минск, 2020.
40. Крыварот А.А. Узаемадзеянне партызанскіх фарміраванняў Беларусі і Расіі ў гады Вялікай Айчыннай вайны / А.А. Крываротт. – Мінск, 2015.
41. Кривошей, Д.А. Судьбы народов Беларуси под оккупацией (июнь 1941 – июль 1944 г.) / Д.А. Кривошей. – М., 2017.
42. Кузьменко, В.И. Советская интеллигенция в партизанском движении в Белоруссии. – Минск, 1991.
43. Куманев, Г. А. Рядом со Сталинам. – Смоленск. 2001.
44. Лемяшонак, У. І. Вызваленне – без грыфа „сакрэтна!“. – Мінск, 1996.
45. Лемешонок, В. И. Идейно-политическая работа Компартии Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. – Минск, 1988.
46. Лиддел Гарт, Б. Г. Вторая мировая война. – М., 1999.

47. Літвін, А. М. Акупацыя Беларусі (1941 – 1944): пытанні супрацiву і калабарацыі. – Мінск, 2000.
48. Літвін, А. М. Вяртанне ў рабства: прымусовая праца насельніцтва Беларусі 1941 – 1945 гг. / А. М. Літвін, Я. А. Грэбень, С. Я. Новікаў; агул. рэд. А. М. Літвіна. – Мінск, 2010.
49. Литвин, А. М. На той войне незнаменитой: советско-финляндская война и Беларусь (1939 – 1940 гг.) / А. М.Литвин. – Минск, 2010.
50. Літвін, А. М. Савецкія святы і партызанскія парады на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны / А. М. Літвін. – Мінск, 2020.
51. Мазуров, К. Т. Незабываемое. – Минск, 1987.
52. Малиновский, Р.Я. Величие победы. – М., 1965.
53. Мельтюхов, М. И. Упущенный шанс Сталина. Советский Союз и борьба за Европу: 1939 – 1941 (Документы, факты, суждения). – М., 2000.
54. Народны летапіс Вялікай Айчыннай вайны: успомнім усіх! Кн. 1 / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; склад.: А. М. Літвін, А. А. Крыварот, К. Д. Ганчарэнка ; рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2020.
55. Новиков, С.Я. Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941 – 1944 гг. – Мінск, 2002.
56. Откровения и признания. Нацистская верхушка о войне Третьего Рейха против СССР. Секретные речи. Дневники. Воспоминания. Пер. с нем. – Смоленск, 2000.
57. Освобождение Беларуси. 1943 – 1944. / ред. кол. И. И. Басик, А. А. Каваленя [и др.] – Минск, 2014.
58. Павлов, Я. С. В суровом сорок первом. – Минск, 1985.
59. Памяць: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1985 – 2004.
60. Пономаренко, П. К. Всенародная борьба в тылу немецко-фашистских захватчиков. 1941 – 1944 . – М., 1986.
61. Проэктор, Д. М. Фашизм: путь агрессии и гибели. М.,1989.
62. Республика-партизанка. К 75-летию Победы в Великой Отечественной войне. Изд. 2-е, доп. и испр. / отв. ред. С. Л. Кандыбович, В. В. Данилович, О. В. Солопова. – М., 2020.
60. Розанов, Г. Л. Сталин-Гитлер: Документальный очерк советско-германских дипломатических отношений, 1939 – 1941 гг. – М.,1991.
63. Рокоссовский, К. К. Солдатский долг. – М., 1988.
64. Россия и СССР в войнах XX века. Потери вооруженных сил. Статистическое исследование. – М., 2001.
65. Семиряга, М. И. Коллаборационизм. Природа, типология и проявление в годы Второй мировой войны. – М., 2000.
66. Сямашка, Я. І. Армія Краёва на Беларусі. – Мінск, 1994.
67. Страна в огне: В 6 кн. / Отв. ред. А. М. Литвин, М. Ю. Мягков. – М., 2011, 2017.
68. Твои сыновья, Беларусь: маршалы, генералы (адмиралы) – белорусы и уроженцы Беларуси в годы Великой Отечественной войны : биографический справочник / сост.: Б. Д. Долготович, А. А. Коваленя. – Минск, 2019.
69. Третьяк, С. А. Трудный путь к Победе / С. А. Третьяк. – Минск, 2015.

70. Умрейко, С. А. Патриотизм учителей и школьников Белоруссии в борьбе против немецко-фашистских оккупантов / С. А. Умрейко, А. И. Залесский, П. Н. Кобринец. – Минск, 1980.
71. Черчилль, У. Вторая мировая война. В 6 т. – М., 1997.
72. Шарков, А. В. Архипелаг ГУПВИ: Военопленные и интернированые на территории Беларуси: 1944 – 1951 гг. – Минск, 2003.
73. Якубовский, Н. А. Помощь советского тыла партизанам: Материально-техническое обеспечение. – Минск, 1973.